# У Гомельскім раёне прайшла прафілактычная акцыя “Не прапальвай сваё жыццё!”




Фінальным акордам акцыі ” Не прапальвай сваё жыццё!” У Гомелі і Гомельскім раёне стала сумеснае мерапрыемства на адкрытай пляцоўцы рэгіянальнага цэнтра культуры і вольнага часу аграгарадка Урыцкае Гомельскага раёна.



Работнікі Гомельскага раённага і Гомельскага гарадскога аддзелаў па надзвычайных сітуацыях сумесна з прадстаўнікамі Беларускага добраахвотнага пажарнага таварыства, АСВОД, Гомельаблгаза і Дзяржэнергагазнагляду падрыхтавалі для жыхароў і гасцей аграгарадка маляўнічае і маштабнае мерапрыемства, якое ўключыла ў сябе працу тэматычных пляцовак.

Кожны жадаючы змог паўдзельнічаць у розных конкурсах і віктарынах, даведацца для сябе важныя правілы па бяспецы, задаць пытанні спецыялістам і атрымаць на іх кампетэнтныя адказы. Акрамя ўсяго гэтага, удзельнікі акцыі атрымалі карысныя прызы ад ратавальнікаў і іншых суб’ектаў прафілактыкі.


104
ПРОИЗВОДСТВЕННОЕ УПРАВЛЕНИЕ
«ГОМЕЛЬГАЗ»
ПРИ ЗАПАХЕ ГАЗА
104
ПРИ ЗАПАХЕ ГАЗА ЗВОНИТЬ 104
ПРОПАН-БУТАН


АШ
МЧС
A (II)
Rh+




— Я палю ўжо больш за дваццаць гадоў, яшчэ са студэнцкай лавы. Шчыра сказаць, бывае і такое, што магу папаліць седзячы на канапе ці крэсле, на кухні, так, палю, але ў ложку — ніколі. Сёння даведаўшыся і ўбачыўшы тое, да чаго можа прывесці такая звычка — кінуць не кіну, самі разумееце, але вось паліць у доме дакладна перастану, нават на кухні. Ужо вельмі страшна стала за сваё жыццё, жыццё сваіх блізкіх і нажытае маёмасць — — прызнаўся Віталь, адзін з удзельнікаў акцыі.

А такіх грамадзян, якія не баяцца паліць у ложку, ды яшчэ і ў стане алкагольнага ап’янення хапае, як у Гомельскім раёне, так і ў горадзе Гомелі. Пажары з іх удзелам штогод мільгаюць у зводках МНС, большасць якіх, на жаль, са смяротным зыходам. Таму ратавальнікі з двух суседніх аддзелаў па НС, сумесна з зацікаўленымі суб’ектамі прафілактыкі вырашылі аб’яднаць намаганні і даць бой «п’янай» цыгарэце.

— Калі пасля кожнага такога мерапрыемства хоць бы адзін чалавек задумаецца аб небяспецы курэння ў ложку, а лепш і зусім адмовіцца ад гэтай шкоднай звычкі, то гэта ўжо велізарны

станоўчы вынік, — адзначыў дырэктар Урыцкага рэгіянальнага цэнтра культуры і вольнага часу Гомельскага раёна Віктар Кавалёў.

Па матэрыялах Гомельскага РАНС

https://sozhnews.by